# ДАКАЗВАЦЬ І ДАКАЗАЦЬ

Святлане ў гімнастычнай зале, куды яе прывялі ў пяцігадовым узросце, спадабалася адразу: можна было адчуць сябе смелай і спрытнай, асвойваючы новыя элементы і спачатку заміраючы ад страху, а пасля начыста забываючыся на яго. І так з дня ў дзень, з году ў год.

Над "арыфметыкай" старанная вучаніца не засядзелася. Калі азы былі завучаны надзейна, прыйшла чарга "алгебры", а затым і "вышэйшай матэматыкі". Неўзабаве лёгкая, элегантная, надзеленая балетнай пластыкай дзяўчынка марыла ўжо пра алімпійскае "золата". Мара не здавалася недасяжнай, але напярэдадні Алімпіяды-88 у Сеуле – сур'ёзная траўма: лічаныя дні да старту, а рука не загаілася. Гіпс знялі, аднак трэба было нават на трэніроўках даказваць і даказаць, што яе месца ў камандзе павінна застацца за ёй. Кіраўніцтва зборнай не рабіла выключэння нават для Баітавай: канкурэнткі моцныя, выбіраць было з каго.

Выстаяць у такой сітуацыі, не страціць вытрымкі і не ўпасці духам няпроста і сталаму, загартаванаму жыццём чалавеку. А тут – кволая шаснаццацігадовая дзеўчынёшка, якой трэба было даказаць, што яна не падмане чаканняў і надзей усіх, хто ў яе верыць...

Трапіць на Алімпійскія гульні – запаветная мара кожнага спартсмена. Гімнастка ж з прычыны спецыфікі яе спартыўнага захаплення, дзе немалую ролю адыгрываюць узроставыя межы, другой магчымасці, акрамя атрыманай у дадзеным канкрэтным чатырохгадовым цыкле, часта проста не атрымлівае.

І таму, убачыўшы на тэлеэкране ў шасцёрцы дзяўчатак, што выходзілі на памост у Сеуле, знаёмую зграбную постаць Баітавай, многія яе сябры і знаёмцы ўздыхнулі з палёгкаю: ёсць першая перамога! І перамога заслужаная! Бо Святлана стала абсалютнай чэмпіёнкай Савецкага Саюза яшчэ ў 1986 годзе.

Зыход алімпійскай бітвы за медалі вырашаўся ў паядынку паміж савецкімі гімнасткамі і румынкамі, чэмпіёнкамі свету і Еўропы. Перамога шмат у чым залежала ад паспяховага старту. І "забойшчыца" Святлана не падвяла: двойчы ў абавязковай праграме пачынала, двойчы ішла другой. Пачын падхапілі ўсе дзяўчаткі – і выступілі проста натхнёна, што, вядома, стала нечаканасцю для румынак.

Залаты алімпійскі медаль каманднага першынства павезла з Сеула ў Магілёў Святлана Баітава, стаўшы першай алімпійскай чэмпіёнкай, выпеставанай у горадзе на Дняпры.

***Даказваць і даказаць : [аб алімпійскай чэмпіёнцы з г. Магілёва Святлане Баітавай] // Мы — беларусы / укладальнікі: Т. М. Бондар, П. П. Рабухін. — Мінск, 2005. — Кн. 2 : На спартыўных арэнах свету. — С. 10.***